

# Александр Андреевич ЕГОРЕЙЧЕНКО

# Аляксандр Андрэевіч ЕГАРЭЙЧАНКА

# Alexandr Andreevich YEGOREICHENKO

Пасля цяжкай і працяглай хваробы 2 снежня 2021 г. пайшоў з жыцця Аляксандр Андрэевіч Егарэйчанка – загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ у 1997–2020 гг., доктар гістарычных навук, прафесар.

Аляксандр Андрэевіч нарадзіўся 23 красавіка 1955 г. у Канатопе (Сумская вобласць, Украіна). Праз некаторы час яго бацька, ваенны лётчык, быў пераведзены з Украіны ў Беларусь. Будучы навуковец скончыў школу ў ваенным гарадку № 92 (цяпер пасёлак гарадскога тыпу Мачулішчы) пад Мінскам і ў 1972 г. паступіў на гістарычны факультэт БДУ. Слухаючы лекцыі па археалогіі, якія чытаў выдатны выкладчык і навуковец Э. М. Загарульскі, юнак захапіўся адкрыццём таямніц першабытнага мінулага. У 1973 г. ён адправіўся ў сваю першую археалагічную экспедыцыю. Яшчэ студэнтам А. А. Егарэйчанка ўдзельнічаў у раскопках гарадзішча сярэдневяковага Рагачова, асвойваў методыку даследавання пахаванняў на Сеніцкіх курганах. Зацікаўленасць навукай паступова перарастала ў прафесію.

У 1977 г. Аляксандр Андрэевіч скончыў універсітэт і паступіў у аспірантуру Інстытута археалогіі АН СССР. Яго навуковым кіраўніком стаў выбітны археолаг В. В. Сядоў. Малады аспірант заняўся вывучэннем старажытных умацаваных паселішчаў, якія ўзводзіліся насельніцтвам беларускага Палесся ў VII–VI стст. да н. э. – II ст. н. э. А. А. Егарэйчанка не толькі распрацаваў класіфікацыю гарадзішчаў і даў комплексную характарыстыку помнікаў, але і прапанаваў рэканструкцыю гісторыка-культурных працэсаў, што адбываліся ў рэгіёне. Заканамерным вынікам руплівай працы стала абарона кандыдацкай дысертацыі ў 1982 г.

На працягу 1980–1987 гг. Аляксандр Андрэевіч быў навуковым супрацоўнікам аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі АН БССР. У цэнтры яго прафесійных інтарэсаў знаходзіліся праблемы жалезнага веку беларускага Палесся. А. А. Егарэйчанка кіраваў раскопкамі на гарадзішчах Івань Слуцкага раёна і Кашчэлічы Валожынскага раёна, селішчах Востраў Пінскага раёна і Давыд-Гарадок Столінскага раёна.

У 1988 г. аўтарытэтны даследчык быў запрошаны ў БДУ. За дзесяць год ён прайшоў шлях ад дацэнта да загадчыка кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін. У 2001 г. у межах удасканалення сістэмы ўніверсітэцкай археалагічнай адукацыі кафедра была рэарганізавана, і Аляксандр Андрэевіч узначаліў абноўленую кафедру археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін. А. А. Егарэйчанка распрацаваў цэлы шэраг агульных і спецыяльных курсаў: «Археалогія», «Жалезны век Беларусі», «Гістарыяграфія археалогіі Беларусі», «Палявая археалогія» і інш. Шматлікія пакаленні студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ, што спасцігалі азы археалогіі на занятках Аляксандра Андрэевіча, запомнілі яго як надзвычай прынцыповага і патрабавальнага выкладчыка.

Нягледзячы на разнастайныя кафедральныя абавязкі, А. А. Егарэйчанка не спыняў актыўную навуковую дзейнасць. Ён завяршыў працу па аналізе палескіх матэрыялаў і падрыхтаваў манаграфію «Древнейшие городища белорусского Полесья (VII–VI вв. до н. э. – II в. н. э.)», якая ўбачыла свет у 1996 г. Адначасова Аляксандр Андрэевіч прыступіў да вывучэння жалезнага веку цэнтральнай і паўночнай Беларусі. Адразу пасля прыходу ў БДУ навуковец заснаваў экспедыцыю, што амаль 30 год праводзіла раскопкі старажытных паселішчаў на

CC BY NC

тэрыторыі Мінскай і Віцебскай абласцей. Набыткамі навукі сталі шматлікія прылады працы, прадметы ўзбраення і ўпрыгожанні, знойдзеныя на гарадзішчах Тарылава, Зазоны, Рацюнкі і на паселішчы Падварынка ў Браслаўскім раёне. Цікавыя вынікі далі раскопкі шэрагу селішчаў другой паловы 1-га – пачатку 2-га тыс. н. э. на Браслаўшчыне. На падставе аналізу назапашаных археалагічных калекцый А. А. Егарэйчанка прапанаваў новы падыход да вызначэння культурнай прыналежнасці насельніцтва цэнтральных і паўночных рэгіёнаў краіны ў канцы 2-га тыс. да н. э. – сярэдзіне 1-га тыс. н. э. Была ўдакладнена і храналогія культурных змен. Вынікі шматгадовых палявых і камеральных даследаванняў ляглі ў аснову манаграфіі «Культуры штрихованной керамики», якая выйшла ў 2006 г., а таксама доктарскай дысертацыі, абарона якой адбылася ў 2008 г. У 2013 г. А. А. Егарэйчанку было прысвоена званне прафесара.

Аляксандр Андрэевіч – аўтар каля 200 навуковых публікацый. Ён актыўна папулярызаваў веды аб мінулым. У выступленнях па радыё, артыкулах у рэспубліканскіх выданнях даследчык імкнуўся пазнаёміць шырокія колы грамадства з дасягненнямі беларускай археалогіі. Навуковец актыўна наладжваў міжнародныя кантакты.

А. А. Егарэйчанка зрабіў унёсак і ў справу падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Тры яго аспіранты, у тым ліку два грамадзяніны Іраку, паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

«Археалогія – гэта не прафесія, а стан душы, – часта паўтараў навуковец і падкрэсліваў: – У археалогіі не бывае лёгкіх шляхоў». Экспедыцыі пад яго кіраўніцтвам станавіліся сапраўднай школай жыцця для першакурснікаў. Многія практыканты, аднак, пазней вярталіся «ў поле» валанцёрамі ці нават вырашалі звязаць свой прафесійны лёс з археалагічнай сферай.

Добрая памяць аб Настаўніку назаўжды застанецца ў сэрцах вучняў А. А. Егарэйчанкі. І можна не сумнявацца, што яго навуковая спадчына будзе запатрабавана наступнымі пакаленнямі даследчыкаў.

***А. У. Вайтовіч*[1]*, П. С. Курловіч*[2]**

[1]*Александра Владимировна Вайтович* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Аляксандра Уладзіміраўна Вайтовіч* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Aliaksandra V. Vaitovich*, PhD (history), docent; associate professor at the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *vaitovich.aliaksandra@gmail.com*

[2]*Полина Сергеевна Курлович* – кандидат исторических наук, доцент; заведующий кафедрой археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Паліна Сяргееўна Курловіч* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Palina S. Kurlovich*, PhD (history), docent; head of the department of archaeology and special historical disciplines, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *kurlovichp@bsu.by*